**Рабоце па папярэджанні арфаграфічных памылак удзяляю шмат увагі на кожным уроку, выкарыстоўваючы эфектыўныя віды заданняў, якія фарміруюць правапісныя ўменні і навыкі.**

# Папярэджваем арфаграфічныя памылкі

На ўроках прымяняю заданні на знаходжанне арфаграм у словах ці ў розных марфемах, займальныя арфаграфічныя хвілінкі, віктарыны-размінкі, слоўнікавыя дыктанты, заданні наступных відаў: тлумачальныя і папераджальныя дыктоўкі, пісьмо па памяці з папярэднім марфаграфічным разборам, каменціраванае пісьмо і запіс тэксту пад дыктоўку з наступнай зверкай з запісам на дошцы, у падручніку або на інтэрактыўнай дошцы, выбарачнае спісванне і выбарачны дыктант.

Адной з найважнейшых умоў фарміравання арфаграфічнай пільнасці вучняў з'яўляецца развіты фанематычны слых. Працуючы над тэмай, я зразумела, што перш за ўсё неабходна навучыць вучняў чуць гукі, вызначаць іх колькасць у словах, адрозніваць галосныя і зычныя, знаходзіць націскныя і ненаціскныя галосныя. На кожным уроку вырашаю арфаграфічныя задачы. Пры гэтым стаўлю перад вучнямі праблемнае пытанне.

Так, напрыклад, пры вывучэнні тэмы "Вымаўленне і правапіс галосных ***о, э, а***" ў 5 класе выкарыстоўваю наступныя віды заданняў для папярэджвання арфаграфічных памылак (табліца 1).

На гэтым жа ўроку ў якасці самастойнай работы выкарыстоўваю заданне "Карэктар". Загадзя падбіраю і раздрукоўваю тэкст з запланаванымі памылкамі. Іх агульная колькасць павінна быць вядома ўсяму класу. Вучні дзеляцца на групы ад 3 да 6 чалавек.

1. Кожны вучань-"карэктар" атрымлівае тэкст і самастойна выпраўляе ў ім памылкі алоўкам.

2. Пасля індывідуальнай праверкі ўдзельнікі групы калектыўна абмяркоўваюць выпраўленае. Узгодненыя недахопы пажадана пазначыць фіялетавым стрыжнем.

3. "Карэктары" мяняюцца тэкстамі, параўноўваюць выпраўленае аднакласнікамі з тэкстам-эталонам, ацэньваюць работу паводле прапанаваных крытэрыяў. У эталоне месцы памылак пажадана пранумараваць. Заданне можна закончыць агульным каменціраваннем дапушчаных памылак.

Пры вывучэнні тэмы "Правапіс -н-, -нн- у прыметніках" у 6 класе выкарыстоўваю табліцу 2.

Пры вывучэнні тэмы "Дзеепрыметнік" у 7 класе на этапе праверкі дамашняга задання прапаную пісьмо па памяці. **Заданне**. *Шмат разоў спалены, ушчэнт зруйнаваны ў апошнюю вайну. Больш за сто тысяч жыхароў забіта, астатнія выселены. Больш чым 90% тэрыторыі былога горада — кучы бітай цэглы, бетону і скручанай арматуры. Здавалася, канец. Але зірніце на Віцебск зараз. Устаў з попелу, як уся Беларусь.*

Адзін з эфектыўных відаў заданняў для павышэння пісьменнасці вучняў, які я выкарыстоўваю на ўроках беларускай мовы, — алгарытм. Заўважыла, што пры фармулёўцы правіла па схеме працуюць два віды памяці — зрокавая і слыхавая. Акрамя таго, развіваецца ўменне лагічна мысліць. Нярэдка сама складаю алгарытм правіла, а вучні потым узнаўляюць яго, але для таго, каб схему алгарытма дзеці зразумелі і засвоілі, яна павінна быць пабудавана разам з вучнямі або імі самастойна.

На інфармацыйным этапе ўрока вучні складаюць алгарытм:

| ПРЫМЕТЫ ДЗЕЕПРЫМЕТНІКА |
|---|
| 1. Які?<br>2. Род.<br>3. Склон.<br>4. Поўная і кароткая формы.<br>5. Лік.<br>6. Паясняе назоўнік.<br>7. Трыванне.<br>8. Стан.<br>9. Час (цяперашні і прошлы)<br>10. У сказе выконвае ролю азначэння або выказніка. |

На кантрольна-вымяральным этапе выкарыстоўваю каменціраванне, якое дапамагае вучням пазбегнуць магчымых памылак і садзейнічае найбольш трываламу засваенню матэрыялу. Вучні чытаюць словы, запісаныя групамі, размяркоўваюць іх у адпаведныя слупкі табліцы і тлумачаць арфаграмы.

| Прыметнік | Дзеяслоў | Дзеепрыметнік |
|---|---|---|
| Чырвоны | Пачырванець | Пачырванелы |

Абноўлены, новы, абнавіць.

Памаладзелы, памаладзець, малады.

На кантрольна-рэфлексійным этапе прапаную тэст-лато па тэме "Дзеепрыметнік як асобая форма дзеяслова". Вучні выбіраюць правільны варыянт і запісваюць яго нумар у бланк.

*Табліца 1.*

| Этапы ўрока | Эфектыўныя заданні | Дзейнасць настаўніка | Дзейнасць вучняў |
|---|---|---|---|
| 1.Арганізацыйна-матывацыйны.<br>Задача этапу: засяродзіць увагу вучняў на тэме і мэтах ўрока | Лексіка-граматычная хвілінка | Прапаную эпіграф: Не толькі р(?)зум, але і с(?)рца дапам(?)гае чалавеку жыць з людзьмі і быць ім карысным. Ж.Лабруер | Працуюць з эпіграфам, самастойна вызначаюць тэму ўрока |
| 2.Актуалізацыя ведаў.<br>Задача этапу: праверыць веданне асаблівасцей вымаўлення галосных гукаў | "Пішы правільна" | Для ўзнаўлення ведаў па дадзенай тэме прапаную адказаць на пытанні:<br>1. Як вымаўляюцца гукі О, Э пад націскам? Якімі літарамі яны абазначаюцца на пісьме?<br>2. Які гук вымаўляецца не пад націскам на месцы гукаў О, Э?<br>3. Што можна сказаць пра напісанне літар О, Э, А? | Адказваюць на пытанні |
| 3.Інфармацыйны.<br>Задача этапу: узнавіць веды вычняў па тэме ўрока | Слоўнікавы дыктант | Прапаную вучням напісаць слоўнікавы дыктант на правапіс складаных назоўнікаў, падчас якога высвятляецца, што ў вучняў ёсць праблемы ў напісанні назоўнікаў разам (асобна), праз дэфіс, з напісаннем галосных ***о, а, е, ё*** | Вучні запісваюць пад дыктоўку словы |
| 4.Замацаванне новых ведаў.<br>Задача этапу: замацаваць атрыманыя веды | Работа з тэкстам | Прапаную тэкст з наступнымі заданнямі: Прачытаць тэкст. Даць яму загаловак. Спісаць тэкст, уставіць прапушчаныя літары. Вызначыць стыль тэксту.<br>Заг..р..лася вясн..вая раніца. Край неба ўсё болей н..ліваўся трапяткой з..л..цістасцю к..леру спелых ячменных к..л..соў. Выступалі са змр..ку лясы. Н..ччу яны п..лохалі, здаваліся веліз..рным ч..рным войскам. Першы пр..мень зарыва ўпаў на мак..ўку старой с..сны і разбудзіў маленькую птушку. Яна здзіўлена і рад..сна ціўкнула. | Вучні працуюць у парах |
| 5.Этап інфармавання вучняў аб дамашнім заданні, інструктаж па яго выкананні<br>Задача этапу: растлумачыць выкананне дамашняга задання | Арфаграфічны слоўнікавы дыктант | Прапаную падрыхтаваць дома арфаграфічны дыктант для суседа, карыстаючыся слоўнікам | Работа вучняў дома па слоўніках |

*Табліца 2.*

| **Этапы ўрока** | **Эфектыўныя заданні** | **Дзейнасць настаўніка** | **Дзейнасць вучняў** |
|---|---|---|---|
| 1.Арганізацыйна-матывацыйны.<br>Задача этапу: засяродзіць увагу вучняў на тэме і мэтах ўрока | "Праблемнае пытанне" | Прапаную тэкст: Раз завяла чараціна з дубам гутарку.<br>— Чаму цябе бура не можа здолець? Моцная бура лютуе над табой. А ты стаіш каменнай сцяной. На тваёй галаве бусел звіў велізарнае гняздо. А я вось стаю тут ды гнуся. Дык скажы мне, дубе, адкуль твая сіла? Чаму я такая слабая?<br>І кажа ёй дуб:<br>— Ты баішся жыцця.<br>— Так, я перад кожным гнуся.<br>— Усім ты хочаш дагадзіць. А хто не спадзяецца на сябе, той і бывае слабы. Змалку я навучыўся дапамагаць сабе. Нікому я не гнуся. (Якуб Колас)<br>Прашу параўнаць прыметнікі з тэксту: "моцная" і "каменнай". | Чытаюць тэкст у парах, адказваюць на пытанне, самастойна вызначаюць тэму і мэты ўрока |
| 2.Інфармацыйны.<br>Задача этапу: дапамагчы вучням засвоіць правілы напісання -н-, -нн- у прыметніках | "Мазгавы штурм" | Прапаную вучням утварыць прыметнікі ад наступных назоўнікаў: вецер, сон, шкло, камень, рэмень, лед, дрэва. Пры праверцы выканання задаю наступныя пытанні:<br>— Пры дапамозе якіх суфіксаў вы ўтварылі прыметнікі?<br>— З якой праблемай сутыкнуліся? (-н- або -нн- трэба пісаць)<br>— Ад чаго залежыць выбар -н- або -нн- у прыметніках? | Вучні запісваюць утвораныя словы, пры праверцы абменьваюцца сшыткамі, адказваюць на пытанні |
| 3.Замацаванне новых ведаў.<br>Задача этапу: замацаваць атрыманыя веды | Работа з інтэрактыўным вучэбна-метадычным дадаткам LearningApps | Прапаную выканаць практыкаванне, выкарыстоўваючы інтэрактыўны вучэбна-метадычны дадатак LearningApps: https://learningapps.org/watch?v=pkywyw7ij01<br>Прапаную размеркаваць прыметнікі на дзве групы: -н-;-нн | Вучні працуюць у парах, выконваюць практыкаванне на камп'ютарах |
| 4.Этап інфармавання вучняў аб дамашнім заданні, інструктаж па яго выкананні.<br>Задача этапу: растлумачыць выкананне дамашняга задання | "Ілюстрацыя да тэмы" | Прапаную падрыхтаваць дома ілюстрацыю да тэмы, падабраць да яе прыметнікі з -н-, -нн- | Работа вучняў дома па ілюстрацыях |
| 5. Рэфлексійна-ацэначны.<br>Задача этапу: прааналізаваць вынікі работы | Слыхавы дыктант | Прапаную пляснуць у далоні адзін раз, калі яны чуюць прыметнік з -н-, два разы — з -нн-: ветраны, асенні, жураўліны, драўляны, ледзяны, старанны, страшэнны, адушаўлёны | Працуюць індывідуальна |

У сваёй рабоце шырока прымяняю эфектыўныя заданні, якія падахвочваюць вучняў да актыўнай разумовай і практычнай дзейнасці. Напрыклад, "Незавершаны ланцужок", "Мазгавы штурм", "Лаві памылку", "Лічбавы дыктант" , "Веру — не веру". Так, на ўроку ў 9 класе па тэме "Паняцце пра складаназлучаны сказ" на этапе праверкі дамашняга задання прапаную прыём "Паспрабуй":

Выберыце правільны адказ:

а) складаназлучаныя сказы могуць складацца толькі з дзвюх частак;

б) складаназлучаныя сказы могуць складацца з дзвюх, трох і больш частак;

в) часткі складаназлучанага сказа могуць быць самастойныя, раўнапраўныя (іх можна памяняць месцамі, і сэнс такога сказа не зменіцца), а могуць залежаць адна ад адной (перастаноўка частак немагчыма);

г) часткі складаназлучанага сказа заўсёды самастойныя, раўнапраўныя.

(Каб даць правільны адказ, прачытайце і прааналізуйце прыведзеныя сказы).

*1. Па ўзаранай раллі чародкамі хадзілі ўвішныя гракі, а на балоце стаялі цыбатыя буслы. 2. Вокны вёскі свяціліся агнямі, і цішыня панавала навокал, і зоркі мігцелі ў вышыні. 3. Там улетку красуецца збажына, а зімою ляжыць халодны снег.*

На інфармацыйным этапе прапаную пазнаёміцца з табліцай.

Аднатыпныя і разнатыпныя часткі ў складаназлучаных сказах (табліца 3).

| Аднатыпныя | Разнатыпныя |
|---|---|
| 1. Уяўляюць сабой два (ці болей) двухсастаўныя сказы: Жанкі жалі сярпамі жыта, а мужчыны дакошвалі куп'істую сенажаць. | Адна частка нагадвае сваёй будовай двухсастаўны сказ, а другая — аднасастаўны: Пайшоў доўгачаканы дождж, і ў паветры пасвяжэла. |
| 2. Уяўляюць сабой два (ці болей) аднасастаўныя сказы: На дварэ імжыла, і ў хаце было няўтульна. | |

На этапе замацавання набытых ведаў выкарыстоўваю выбарачны дыктант. Неабходна выпісаць толькі складаназлучаныя сказы. Вызначыць межы частак складаназлучаных сказаў і сродкі сувязі. Пабудаваць схемы складаназлучаных сказаў (1, 2, 4, 5 сказы). Знайсці слова па яго лексічным значэнні: дошчачкі з пазамі для пакрыцця дахаў (гонты). Растлумачыць арфаграмы.

*1.Чырвоная дуга сонца паказалася над лясной грываю, і туман адразу пачаў радзець. 2 Дождж не ішоў, але ўсё вакол завалакло вільготнай шэрасцю. 3. Ляці ж, наша песня, і звіні над светам . 4. Па сонцу і вясне душа засумавала, і хочацца ўзысці на рубяжы. 5. Пішу, а ў памяці і сэрцы ажылі ўсе пачуцці. 6. Абапал роўных вуліц выраслі рады новых дамоў, пакрытых гонтай, чарапіцай, шыферам, а то і бляхай.*

На рэфлексійна-ацэначным этапе вучні заканчваюць фразы, запісаныя на дошцы: Я дакладна ведаю… Я зрабіў(ла) вывад… Я цяпер змагу…

Вынік адукацыйнага працэсу, на маю думку, — гэта веды, абумоўленыя патрабаваннямі вучэбнай праграмы агульнаадукацыйнай школы, вучэбныя і даследчыцкія кампетэнцыі, рэфлексіўная культура, актыўная жыццёвая пазіцыя выпускнікоў, іх грамадзянская адказнасць, творчы патэнцыял, а таксама рост прафесійнага майстэрства настаўніка.

**Нэля АРЦЮШЭНКА,**
**настаўніца беларускай мовы і літаратуры сярэдняй школы № 14 Мазыра.**